Прэзідэнт лаканічны: «Той, хто хоча нармальна жыць, той жыве». Час складаны, пагаджаецца ён, але гэта яшчэ і час магчымасцяў. Каму не хапае грошай, магчымасць зарабіць ёсць. Іншая справа, што лёгкіх грошай не бывае. Хочаш нешта мець — трэба варушыцца.

Прэзідэнт шчыра прызнаўся: ён не можа глядзець спакойна на вялікі разнабой у заробках. Калі ў адным магазіне загадчык атрымлівае 75—95 тысяч долараў у месяц, а прадавец, кантралёр-касір — 1200 рублёў. «У аснове павінна ляжаць справядлівасць, — перакананы Аляксандр Лукашэнка. — Не эканамічная катэгорыя, але вельмі важная для людзей. Усіх прывядзём у пачуцці, выпрацуем адпаведныя правілы, дакументы».

Іншая справа — не ўсе хочуць працаваць па новых правілах. «Некаторыя кажуць: мы кінем і пойдзем кудысьці, — удакладняе кіраўнік дзяржавы і адразу дае параду: — Перш чым пайсці, вы патэлефануйце ў Польшчу збеглым і ў Літву, спытайце, ёсць там месца, куды сысці. Вы не ведаеце, колькі з іх просіцца назад. Я нікому не забараняю вяртацца. Як з'ехалі, так і вяртайцеся. Але калі вінаватыя, па законе трэба адказваць. Калі толькі нехта дэманстрацыйна, ці то іэшнік, ці то заўмаг або яшчэ хтосьці, кіне работу — наручнікі. Чаму? Бо такім чынам вы спрабуеце дэстабілізаваць грамадства. Вы прыйшлі працаваць у краму — працуйце. Вы хацелі пабудаваць краму, мы ж вам дазволілі і дапамаглі: крэдыты далі і іншае. Як гэта вы цяпер усё кінеце і пойдзеце?»

У той жа час, як адзначыў Прэзідэнт, амаль ніхто з іншаземцаў, якія стварають на нашым рынку бізнес, не ўцёк. Калі іх планы памяняюцца, вялікай бяды не будзе — на іх месца прыйдуць нашы, беларускія, вытворцы. «Калі ёсць пэўная праблема — цябе заўтра ва ўрадзе, у міністэрстве прымуць, — працягвае Прэзідэнт у дачыненні да тых, хто плануе пакінуць рынак. — Па цэнах штосьці не складваецца — палічым — мы лічыць умеем». Калі нехта не хоча працаваць, сыходзіць трэба годна. Інакш на такія выхадкі ва ўлады ёсць свае рычагі. «Свята месца пуста не бывае, — згодны з народнай мудрасцю беларускі лідар. — Адзін сышоў — прыйдзе іншы. Не будзе ніякага дэфіцыту. Ніякага! Мы ў стане сёння забяспечыць свой народ усім неабходным. І яшчэ суседзям прадаць па добрай цане».

### ГАЛОЎНАЯ МАРА ПРЭЗІДЭНТА

Працоўных хвалявала і яшчэ адно пытанне: сацыяльная інфраструктура горада-спадарожніка (Рудзенска) не паспявае за БНБК. Жыхары маюць патрэбу ў дзіцячым садку, школе і паліклініцы. «Усё, што трэба, пабудуем і зробім, — паабяцаў Прэзідэнт. — Усё, што трэба, у патрэбны час зробім». Аляксандр Лукашэнка расказаў, што цікавіўся пытаннем сацыяльнай інфраструктуры. Насельніцтва рэгіёна будзе расці, таму, натуральна, тут з'явяцца і дзіцячыя садкі, і школы. «Для нас не праблема пабудаваць, аднак калі гэта будзе патрэбна, — акцэнтаваў увагу кіраўнік дзяржавы. — Будзеце нараджаць — будуць і дзіцячыя садкі. Мы цяпер выбудоўваем сацыяльныя праграмы па жыллі. Шматдзетныя — у прыярытэце. На працягу года, максімум двух, мы абавязкова забяспечым шматдзетных жыллём, бо гэта больш важна, чым БНБК. Дэмаграфічная бяспека — незалежнасць нашай краіны».

Прэзідэнт заявіў, што неабходна забяспечыць прырост насельніцтва, таму ў найбліжэйшы час будуць перагледжаны ўсе льготы. Дзе гэта будзе магчыма, яны будуць перанесены на шматдзетных, ваеннаслужачых — тых, хто не можа займацца бізнесам.

Адна з супрацоўніц прадпрыемства, якая не так даўно вярнулася з Украіны, дзе працавала, у родную Беларусь, расказала, што цяпер яна шчаслівая: ёсць і сям'я, любімая работа, сваё жыллё — галоўнае, на радзіме. А ці шчаслівы Аляксандр Лукашэнка, спытала яна. Прэзідэнт адказаў, што будзе шчаслівы, калі з яго роднай Украіны (адтуль у тым ліку яго карані) людзі не будуць бегчы так, як цяпер. «Аднак гэта нашы людзі, і колькі трэба, мы будзем людзей прымаць, карміць, лячыць», — падкрэсліў беларускі лідар.

Напрыканцы сустрэчы кіраўнік дзяржавы сказаў, што самая галоўная яго мара — каб не было вайны. «Я хачу, каб мы спакойна жылі, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Таму давайце працаваць, спакойна жыць. І, як я ўжо казаў, займайцеся сваёй справай. Ні ў якім разе не допускайце нават самай малой расхлябанасці, недысцыплінаванасці, што прывядзе абавязкова да дэстабілізацыі абстаноўкі. Гэтым з радасцю скарыстаюцца нашы праціўнікі».

***

Калектыў БНБК не адпусціў кіраўніка дзяржавы без падарунка. Прэзідэнту падарылі эксклюзіўны абедзенны стол. У яго цэнтры, пад шклом, са збожжа выкладзены ўзор. Як растлумачыў гендырэктар прадпрыемства Даніл Урыцкі, па кітайскай традыцыі падарунак сімвалізуе бясконцае шчасце: круглы стол, без вуглоў, разлічаны на восем персон, гэтая лічба сімвалізуе бясконцасць. Згодна з беларускай традыцыяй, ён сімвалізуе багацце і ўрадлівасць — аб гэтым сведчыць стылізацыя стала пад айчынную вышыванку. Падарунак звязаны і з тэхналогіямі. Белая драўніна — тэхналогія, звязаная з тысячагадовай гісторыяй Беларусі. Са збожжа, якім аздоблены стол, на БНБК выпрацоўваюць амінакіслоты, а гэта ўжо тэхналогія XXI стагоддзя.

**Валерыя СЦЯЦКО, Вераніка КАНЮТА.**

*Пухавіцкі раён.*

**У тэму**

### Чарговы яркі ўзор супрацоўніцтва Беларусі і Кітая

Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Беларусі Се Сяаюн у размове з журналістамі назваў БНБК стратэгічным аб'ектам у біялагічнай галіне Беларусі. «Я хачу падкрэсліць, што кітайскі Урад надае вялікае значэнне гэтаму праекту. І работы выконвала адна з найлепшых кітайскіх кампаній. Усё гэта сведчыць аб высокім узроўні адносін Кітая і Беларусі. Можна сказаць, гэты грандыёзны праект — чарговы яркі ўзор і новая візітка гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі. Кітайска-беларускія адносіны знаходзяцца ў добрай стадыі свайго развіцця. Сёлета мы ўстанавілі новы рэкорд — за дзевяць месяцаў гэтага года рост тавараабароту паміж нашымі краінамі па нашай статыстыцы склаў больш за 25,8 працэнта. І, акрамя гэтага, нашы сумесныя ініцыятывы «Адзін пояс — адзін шлях» таксама дасягнулі вынікаў. Нашымі краінамі пабудаваны індустрыяльны парк «Вялікі камень», ён ужо стаў узорным праектам на «Шаўковым шляху». Цяпер у ім 99 рэзідэнтаў з 15 краін. Нягледзячы на негатыўныя наступствы эпідэміі і іншых фактараў, абстаноўка ў «Вялікім камені» паляпшаецца з кожным днём», — сказаў Се Сяаюн.

# НАВІНКІ ХАРЧПРАМА І КАСМІЧНЫЯ АПАРАТЫ

## Што прадставіць Беларусь на выставе імпарту ў Кітаі

**Нацыянальная экспазіцыя Рэспублікі Беларусь адкрыецца сёння на 5-й Кітайскай міжнароднай выставе імпарту (CIIE) у Шанхаі, паведамілі БелТА ў «Белінтэрэкспа» Беларускай гандлёва-прамысловай палаты.**

У беларускай экспазіцыі прымуць удзел 27 арганізацый харчовай прамысловасці, лагістыкі, навукі і адукацыі. Павільён Беларусі на выставе імпарту прадставіць два асноўныя раздзелы: «Харчовая і сельскагаспадарчая прадукцыя» і «Высокатэхналагічнае абсталяванне і інфармацыйныя тэхналогіі».

У павільёне «Харчовая і сельскагаспадарчая прадукцыя» прэзентуюць прадукцыю прадпрыемстваў канцэрна «Белдзяржхарчпрам» і малакаперапрацоўчых прадпрыемстваў Беларусі. Сектар высокатэхналагічнага абсталявання і інфармацыйных тэхналогій прадстаўляюць арганізацыі Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях, Нацыянальнай акадэміі навук, Міністэрства адукацыі, а таксама «Гродна Азот», «Полацк-Шкловалакно», Светлагорскі цэлюлозна-кардонны камбінат, «СветлагорскХімвалакно».

Прэзентуюць таксама перадавыя распрацоўкі: звышмалыя арбітальныя касмічныя апараты і серыя супрацьракавых лекавых сродкаў (Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт), электраскутары (прыборабудаўнічы завод «Аптрон»), беспілотны лятальны апарат «Буравеснік» (Навукова-вытворчы цэнтр шматфункцыянальных беспілотных комплексаў НАН Беларусі), аўтаматызаваная сістэма рэгістрацыі зварачных працэсаў (Беларуска-расійскі ўніверсітэт), тэрмаўстойлівыя ўдаратрывалыя пакрыцці (Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны), хлеб павышанай харчовай каштоўнасці (Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт харчовых і хімічных тэхналогій) і многае іншае.

У рамках Кітайскай міжнароднай выставы імпарту будзе працаваць віртуальны павільён Беларусі. У ім адлюстраваны дасягненні ў прамысловасці, навукова-тэхнічныя інавацыі, турыстычны і культурны патэнцыял нашай краіны.

Як вядома, Кітайская міжнародная выстава імпарту (CIIE) — найбуйнейшае выставачнае мерапрыемства КНР. У мінулым годзе ў выставе прынялі ўдзел 2,9 тысячы кампаній са 127 краін. Мерапрыемства наведалі звыш 480 тысяч чалавек. Арганізатарамі выступаюць Міністэрства камерцыі КНР і Народны ўрад Шанхая. У цырымоніі адкрыцця традыцыйна ўдзельнічаюць кіраўнікі дзяржаў і члены ўрадаў дзясяткаў краін.

Прывітанне ў фармаце відэазвароту Старшыні Кітайскай Народнай Рэспублікі Сі Цзіньпіну, удзельнікам і гасцям пятай Кітайскай міжнароднай выставы імпарту ў Шанхаі накіраваў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.

«З'яўляючыся важнай часткай еўразійскай прасторы, наша дзяржава стаяла каля вытокаў стварэння Еўразійскага эканамічнага саюза. Мы ўдзяляем асаблівую ўвагу праектам у рамках кітайскай ініцыятывы «Пояс і шлях», сярод якіх найбольш значны — размешчаны ў нас індустрыяльны парк «Вялікі камень», — сказаў беларускі лідар. Ён таксама выказаў гатоўнасць нашай краіны да пашырэння сумеснай работы па пастаўках высакаякаснай прадукцыі і рэалізацыі новых праектаў у галіне электроннага гандлю. Беларусь гатова прадоўжыць цеснае супрацоўніцтва з усімі зацікаўленымі бакамі для дыверсіфікацыі маршрутаў рэгулярных транзітных перавозак і ўкаранення інавацыйных лагістычных падыходаў.

«Будучы надзейнымі і праверанымі саюзнікамі, «жалезнымі братамі», мы эфектыўна працуем у галіне кааперацыі, інавацый, лагістыкі», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы ў відэазвароце. Ён адзначыў, што наша краіна бярэ ўдзел у гэтай выставе з моманту яе заснавання. Сёлета ў мерапрыемстве ў Шанхаі ўдзельнічаюць два дзясяткі вядомых беларускіх вытворцаў. Экспаненты прэзентуюць нашы перадавыя напрацоўкі ў вытворчасці высокатэхналагічнага абсталявання, сферах інфармацыйных тэхналогій, медыцыны.

«Перакананы, што Кітайская выстава імпарту ў Шанхаі надасць магутны імпульс пашырэнню міжнароднага эканамічнага супрацоўніцтва і тэхналагічнай кааперацыі», — выказаў упэўненасць Аляксандр Лукашэнка.

# Наваселле супала з юбілеем

**Урачыстае адкрыццё новага будынка 15-й гарадской паліклінікі ў Мінску адбылося з удзелам Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі КАЧАНАВАЙ.**

Ахова здароўя — гэта прыярытэтны напрамак дзяржаўнай сацыяльнай палітыкі, адзначыла спікер. «І тая ўвага, якую ўдзяляюць улады, Прэзідэнт нашай краіны сістэме аховы здароўя, заслугоўвае ўсякай пахвалы і падзякі. Вы бачыце, што ў нашай краіне ўсе сацыяльныя гарантыі для людзей выконваюцца. Будуюцца медыцынскія ўстановы і рэканструююцца ўжо дзеючыя, забяспечваюцца новым абсталяваннем, умацоўваецца матэрыяльна-тэхнічная база», — падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі.

«Так супала, што адкрыццё новага будынка паліклінікі супадае з яе юбілеем. Яна працуе ўжо з 1962 года. Але тады гэта быў невялікі будынак. І таму было прынята рашэнне, і ўлады горада Мінска зрабілі ўсё для таго, каб сёння для жыхароў Маскоўскага раёна былі камфортныя ўмовы пры атрыманні медыцынскіх паслуг, — дадала Наталля Качанава. — Мы ўдзячныя нашым урачам за тое, што яны робяць усё, каб мы былі здаровыя. Я шчыра дзякую вам за вашу працу, прафесіяналізм, за ўсё, што вы робіце для нашых людзей. Бо што такое для чалавека ягонае здароўе і яго блізкіх? Па-мойму, гэта найважнейшае і галоўнае. Нізкі паклон вам за вашу працу і ўсяго вам самага добрага. Я рада, што ў гэтай паліклініцы тыя традыцыі, якія былі закладзеныя старэйшымі пакаленнямі, працягваюцца. І калі мне сказалі аб тым, што 20 маладых спецыялістаў прыйшло працаваць у гэтую медыцынскую ўстанову, я парадавалася, таму што гэта выдатна».

**Паводле БелТА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Сі Цзіньпін: ЕС не павінен аказацца ў залежнасці і быць пад кантролем трэцяга боку

**Еўрасаюз не павінен знаходзіцца пад кантролем якога-небудзь трэцяга боку, заявіў старшыня КНР Сі Цзіньпін падчас сустрэчы з канцлерам ФРГ Олафам Шольцам, перадае ТАСС.**

Ён выказаў надзею, што Еўропа будзе стабільнай і квітнеючай і змажа захаваць лінію ў развіцці адносін з Кітаем, якая існуе цяпер. «Нельга залежаць і быць падкантрольным трэцяму боку», — сказаў ён.

Сі Цзіньпін адзначыў, што Кітай заўсёды разглядаў Еўрасаюз як партнёра і падтрымлівае яго самастойную палітыку. Як звярнуў увагу старшыня КНР, нават ва ўмовах складанай знешнепалітычнай кан'юнктуры Кітай імкнецца падтрымліваць з Еўропай узаемавыгадныя адносіны.

Больш за тое, ён паведаміў аб гатоўнасці Пекіна ўзмацніць супрацоўніцтва з Германіяй і Еўропай, каб урэгуляваць міжнародныя пытанні. Паводле яго слоў, Кітай зацікаўлены ва ўмацаванні кантактаў з Германіяй і Еўрасаюзам пры вырашэнні праблем кліматычных змяненняў, харчовай бяспекі і забеспячэння біялагічнай разнастайнасці планеты.

### Кангрэсвумен Грын паведаміла, што пры перамозе рэспубліканцаў Украіна «не атрымае ні цэнта»

**Член палаты прадстаўнікоў ад Рэспубліканскай партыі Маржоры Тэйлар Грын лічыць, што калі перамогу на прамежкавых выбарах у Кангрэс атрымаюць рэспубліканцы, то фінансаванне Украіны будзе максімальна скарочана. Пра гэта паведамляе РІА «Навіны».**

Сітуацыю з падтрымкай Кіева і далейшымі перспектывамі яна ацаніла на выступленні перад выбаршчыкамі ў штаце Аёва.

«Дэмакраты расчынілі нашу граніцу насцеж, але адзіная граніца, якая іх хвалюе, — гэта Украіна, а не паўднёвая частка Амерыкі. Пры рэспубліканцах Украіне не дастанецца ні цэнта! — лічыць палітык. Па словах Грын, Злучаныя Штаты больш важныя і прыярытэтныя ў эканамічным плане.

Прамежкавыя выбары ў амерыканскі кангрэс пройдуць 8 лістапада.